ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧАЦВЕР, 30 ЧЭРВЕНЯ 1938 г. № 36 (378)

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Управлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ПРЫВІТАННЕ ДЭПУТАТАМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР!





БЛІСКУЧАЯ ПЕРАМОГА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

Дзень 26 чэрвеня з'явіўся днём урачыстасці беларускага народа. Грамадзяне Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі выбіралі дэпутатаў у свой вярхоўны орган улады — Вярхоўны Совет БССР. Гісторыя чалавецтва не ведае такіх усеагульных, роўных і прамых выбараў, сапраўды свабодных, сапраўды дэмакратычных, якімі з'яўляюцца выбары ў нашай краіне, выбары па Сталінскай Канстытуцыі перамогшага соцыялізма.

Беларускі народ на аснове сваёй Канстытуцыі, пабудаванай у адпаведнасці са Сталінскай Канстытуцыяй СССР, правёў выбары вярхоўнага органа ўлады сваёй рэспублікі. Гэтыя выбары яшчэ вышэй узнялі палітычную актыўнасць і ўдзел працоўных мас у дзяржаўным кіраванні. Вялікае яднанне ўрада і народа, мыслімае толькі ў соцыялістычнай краіне, выразілася перш за ўсё ў тым, што ўсе выбаршчыкі спяшаліся, ахопленыя глыбокай еднадушнасцю, выканаць свой высокі грамадзянскі абавязак і прыняць удзел у галасаванні.

Сваім першым дэпутатам у Вярхоўны Совет БССР беларускі народ выбраў таго, хто разам з Леніным будаваў і вёў ад перамогі да перамогі нашу большэвіцкую партыю, чыё імя — сцяг і сімвал усіх перамог соцыялізма, надзея і гордасць усяго працоўнага і прагрэсіўнага чалавецтва, — творца беларускай дзяржаўнасці, лепшага друга беларускага народа, усенароднага дэпутата таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

З гэтым самым дарагім, самым блізкім імем на вуснах і ў сэрцах ішлі ўсе працоўныя БССР на выбары, з гэтым імем на вуснах і ў сэрцах яны галасавалі за партыю Леніна—Сталіна, за совецкую радзіму, за яе лепшых сыноў і дачок. У ліку выбраных дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР любімыя народам бліжэйшыя саратнікі таварыша Сталіна — таварышы В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Н. І. Ежоў, А. А. Жданаў.

Выбраныя дэпутаты—гэта сотні сталінскіх выхаванцаў, партыйных і непартыйных большэвікоў, герояў, якіх магла стварыць і стварыла толькі Сталінская эпоха.

26 чэрвеня было днём выбараў у Вярхоўныя Советы Беларускай ССР, РСФСР, Украінскай ССР. Беларускі народ разам з усімі братнімі народамі, насяляючымі РСФСР, разам з шчаслівымі народамі Совецкай Украіны прышоў за выбарчых урнаў з імем вялікага Сталіна. У дружнай згуртаванай сям'і народаў Совецкага Саюза рускі народ карыстаецца любоўю і павагай, бо рускі рабочы клас паралзіў, стварыў партыю Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам якой заваяваны сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма.

За свабоднае соцыялістычнае жыццё, за далейшы яго росквіт, за росквіт культуры і асветы, навукі і мастацтва беларускага вызваленага народа галасаваў кожны выбаршчык, апускаючы ў выбарчую урну бюлетэнь з імем кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У Прамысловай выбарчай акрузе сталіцы БССР, дзе балатыраваўся таварыш Сталін, і ва ўсіх акругах, дзе балатыраваліся бліжэйшыя саратнікі вялікага Сталіна таварышы В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, Н. І. Ежоў, А. І. Мікаян, А. А. Андрэеў, А. А. Жданаў, у галасаванні прынялі ўдзел усе 100 працантаў выбаршчыкаў.

Сталін — першы любімы дэпутат беларускага народа ў Вярхоўны Совет БССР.

Сталін—першы любімы дэпутат Вярхоўных Советаў усіх адзінаццаці свабодных, квітнеючых рэспублік вялікага Совецкага Саюза.

Працоўныя Совецкай Беларусі, галасаваўшыя за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, ведаюць і ніколі не забудуць, што «да перамогі совецкага ладу беларускі народ быў амаль цалкам непісьменны. У Совецкай Беларусі непісьменнасць у асноўным ліквідавана. Права на адукацыю запісана ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі і ў створанай на яе аснове Канстытуцыі Беларускай ССР. З году ў год расце сетка школ па рэспубліцы. У БССР зараз працуе 6.993 школ, дзе дзеці працоўных вучацца на роднай мове, аб чым да перамогі пралетарскай рэвалюцыі беларускі народ не мог і марыць. Совецкая Беларусь мае сваю Акадэмію навук, дзесяткі вышэйшых навучальных установ, свае выдавецтвы, тэатры, клубы, бібліятэкі. Пышным кветам расцвітаюць мастацтва і культура беларускага народа — нацыянальныя па форме, соцыялістычныя па зместу»...

Галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, кожны выбаршчык галасаваў за далейшы росквіт Совецкай Беларусі, за ўмацаванне яе абароназдольнасці як фарпоста вялікага Совецкага Саюза, галасаваў за любімую народам Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, Ваенна-Марскі Флот, за выкарчоўванне і знішчэнне ворагаў народа — германа-польскіх дыверсантаў і шкоднікаў, за далейшы росквіт культуры і мастацтва беларускага народа.

Галасуючы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, кожны выбаршчык галасаваў за партыю Леніна—Сталіна, у якой словы ніколі не разыходзяцца са справай, за партыю, пад кіраўніцтвам якой беларускі народ разграміў ворагаў народа, стварыў сваю дзяржаву — фарпост магутнага вялікага Совецкага Саюза на яго заходніх граніцах.

Дзень 26 чэрвеня ўвойдзе ў гісторыю беларускага народа як дзень яго велізарнейшай урачыстасці сярод роўнапраўных народаў вялікага Совецкага Саюза, як дзень дэманстрацыі вернасці нашага народа геранчнаму сцягу Леніна—Сталіна.

Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Леніна—Сталіна!

ПАВЕДАМЛЕННЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ ВЫНІКАХ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР

Усяго па Беларускай ССР ёсць 3.878 выбарчых участкаў і 273 выбарчыя акругі па выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР.

К 16 гадзінам 27 чэрвеня быў закончан падлік галасоў па ўсіх акругах.

Па даных акруговых выбарчых камісій зарэгістравана выбранне ўсіх 273 дэпутатаў, якія з'яўляюцца кандыдатамі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

З агульнай колькасці 3.040.710 выбаршчыкаў у галасаванні на выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР прыняла ўдзел 3.030.148 выбаршчыкаў, што складае 99,65 проц.

Ва ўсіх выбарчых акругах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР галасавала за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных 3.005.609 чалавек, што складае 99,19 проц. усёй колькасці прымаўшых удзел у галасаванні.

Колькасць выбаршчыкаў павялічылася ў параўнанні з выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР на 33.368, колькасць прыняўшых удзел у галасаванні—на 110.482.

Па сталіцы Беларусі—Менску прыняло ўдзел у галасаванні 100 проц. выбаршчыкаў. Па Прамысловай выбарчай акрузе г. Менска дэпутатам Вярхоўнага Совета Беларускай ССР аднадушна выбран усенародны кандыдат, вялікі правадыр народаў таварыш СТАЛІН Іосіф Вісарыёнавіч. З такой-жа аднадушнасцю выбраны ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР бліжэйшыя саратнікі вялікага СТАЛІНА: таварыш МОЛАТАЎ Вячэслаў Міхайлавіч— па Дзержынскай выбарчай акрузе горада Менска, таварыш ВАРАШЫЛАЎ Клімент Ефрэмавіч—па Молатаўскай выбарчай акрузе горада Менска, таварыш КАГАНОВІЧ Лазар Майсеевіч—па Сталінскай выбарчай акрузе горада Гомеля, таварыш КАЛІНІН Міхаіл Іванавіч—па Куйбышэўскай выбарчай акрузе горада Магілева, таварыш МІКАЯН Анастас Іванавіч—па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе, таварыш АНДРЭЕЎ Андрэй Андрэевіч—па Ленінскай выбарчай акрузе горада Гомеля, таварыш ЕЖОЎ Нікалай Іванавіч—па Ленінскай выбарчай акрузе горада Віцебска, таварыш ЖДАНАЎ Андрэй Александравіч —па Валадарскай выбарчай акрузе горада Віцебска.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР.

СПІСАК ДЭПУТАТАЎ, ВЫБРАНЫХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Сталін Іосіф Вісарыёнавіч — Прамысловая акруга гор. Менска.

Молатаў Вячэслаў Міхайлавіч — Дзержынская акруга гор. Менска.

Варашылаў Клімент Ефрэмавіч — Молатаўская акруга гор. Менска.

Кагановіч Лазар Майсеевіч — Сталінская акруга гор. Гомеля.

Калінін Міхаіл Іванавіч — Куйбышэўская акруга гор. Магілева.

Мікаян Анастас Іванавіч — Мазырская гарадская акруга.

Андрэеў Андрэй Андрэевіч — Ленінская акруга гор. Гомеля.

Ежоў Нікалай Іванавіч — Ленінская акруга гор. Віцебска.

Жданаў Андрэй Аляксандравіч — Валадарская акруга гор. Віцебска.

Панамарэнка Панцелеймов Кандрацьевіч — Кагановіцкая акруга гор. Віцебска.

Ананьеў Анатолій Андрэевіч—Ульская акруга.

Узілеўскі Шлёма Мордухавіч—Асвейская акруга.

Мельнікаў Нікалай Пятровіч — Расонская акруга.

Ясючэнка Васілій Сямёнавіч — Чырвонаборская акруга.

Крупеня Іван Ануфрыевіч — Дрысенская акруга.

Драздова Варвара Васільеўна — Боркавіцкая акруга.

Ваднёў Трафім Афанасьевіч — Баравухская акруга.

Ефрэмаў Васілій Васільевіч—Юравіцкая акруга.

Снегаў Фядот Пракоф'евіч — Полацкая сельская акруга.

Уралава Еўдакія Ільінічна — Полацкая гарадская акруга.

Голікаў Філіп Іванавіч — Полацкая — Сталінская акруга.

Шыбалка Владзімір Гаўрылавіч — Ветрынская акруга.

Чаплыгін Аляксей Георгіевіч — Фарыноўская акруга.

Крыскевіч Ефрасінья Кірылаўна — Кубліцкая акруга.

Шарыпа Дар'я Філіпаўна—Ушацкая акруга.

Кішчэнка Еўгенія Карпаўна—Каменская акруга.

Мельнікаў Сяргей Пятровіч — Лепельская сельская акруга.

Буценка Дзмітрый Нікіфаравіч — Лепельская гарадская акруга.

Волкаў Еўсцігней Іларыёнавіч — Валасоўская акруга.

Сухоцкая Анна Цімафееўна — Бешанковіцкая акруга.

Казачонак Дзмітрый Еўдакімавіч — Бешанковіцкая сельская акруга.

Калінін Пётр Захаравіч — Чашніцкая акруга.

Падалец Екацярына Платонаўна — Чашніцкая сельская акруга.

Мацюшка Адам Міхайлавіч—Чарэйская акруга.

Кунцэвіч Кузьма Майсеевіч — Талачынская акруга.

Макеенка Фёдар Варфаламеевіч — Коханаўская акруга.

Шэлкоў Владзімір Паўлавіч — Талачынская сельская акруга.

Лежнін Нікіта Фёдаравіч — Сенненская акруга.

Казлоўскі Іван Васільевіч—Раснянская акруга.

Сцяпанава Марыя Антонаўна — Смалянская акруга.

Ціхінская Ефрасінья Канстанцінаўна — Еромкавіцкая акруга.

Калінічаў Цімафей Васільевіч — Панізоўская акруга.

Гусеў Дзмітрый Сцяпанавіч — Аршанская сельская акруга.

Наталевіч Нікіфар Якаўлевіч — Аршанская гарадская акруга.

Радноў Пётр Якаўлевіч — Аршанская—Чыгуначная акруга.

Пажарная Еўдакія Іванаўна — Дубровенская гарадская акруга.

Патапаў Пётр Андрэевіч — Дубровенская сельская акруга.

Самошкін Аляксандр Ільіч—Ляднянская акруга.

Мураўёва Анна Васільеўна—Высачанская акруга.

Чарнышова Мар'я Афанасьеўна — Лёзнянская акруга.

Паліцын Іван Станіслававіч — Добрамысленская акруга.

Рабцаў Ілья Нікалаевіч — Багушэўская акруга.

Цярэнцьеў Пракоп Герасімавіч — Багушэўская сельская акруга.

Беляеў Спірыдон Маркавіч — Старасельская акруга.

Сарокін Пётр Васільевіч—Селюцкая акруга.

(ПРАЦЯГ ГЛ. НА 2-й СТАР.).

СПІСАК ДЭПУТАТАЎ, ВЫБРАНЫХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР

(ПРАЦЯГ).

Жылянін Акім Аляксандравіч—Бараўлянская акруга.

Багрыноўскі Міхаіл Ігнацьевіч — Віцебская Фрунзеўская акруга.

Майораў Дзмітрый Нікіфаравіч — Віцебская — Пролетарская акруга.

Матлахаў Дзмітрый Арсенцьевіч — Віцебская — Мопраўская акруга.

Ханіна Еўгенія Саламонаўна — Віцебская — Вакзальная акруга.

Немчанка Ольга Афанасьеўна — Віцебская — Кіраўская акруга.

Краўчанка Антаніна Усцінаўна — Шумілінская акруга.

Каровін Іван Сямёнавіч — Сіроцінская акруга.

Берковіч Гіля Мендэлевіч—Гарадоцкая акруга.

Рыбакоў Філіп Егоравіч — Гарадоцкая — Валадарская акруга.

Кабзова Фёкла Міхайлаўна—Ноўкінская акруга.

Аніскавец Васілій Трафімавіч — Суражская акруга.

Дзмітрыеў Владзімір Іванавіч — Яновіцкая акруга.

Рыбікаў Нікалай Абрамавіч — Езерышчанская акруга.

Малін Владзімір Нікіфаравіч—Межынская акруга.

Лодысеў Сяргей Цярэнцьевіч — Круглянская акруга.

Ярковіч Ольга Авілаўна — Паўлаўская акруга.

Бандаркова Марфа Кірылаўна — Шклоўская гарадская акруга.

Міцкевіч Анастасія Грыгор'еўна — Шклоўская сельская акруга.

Казлоў Кірыл Ісідаравіч — Высокская акруга.

Кірзеў Міхаіл Паўлавіч — Фашчэўская акруга.

Церэхаў Іван Феадосьевіч — Горацкая сельская акруга.

Захараў Сяргей Сцяпанавіч—Горацкая гарадская акруга.

Новікава Фіонія Архіпаўна — Горацкая Ленінская акруга.

Серышэў Васілій Міхайлавіч—Дрыбінская акруга.

Гарнастаеў Аляксей Сямёнавіч — Дрыбінская сельская акруга.

Свінцоў Аляксандр Аляксеевіч — Мсціслаўская акруга.

Папкоў Лазар Еўдакімавіч — Хадасоўская акруга.

Казлоў Гаўрыла Васільевіч — Курманаўская акруга.

Бакланаў Грыгорый Мітрафанавіч — Крычаўская гарадская акруга.

Вырво Парфен Андрэевіч—Крычаўская сельская акруга.

Мацюшка Варвара Феафілаўна — Чавуская сельская акруга.

Маханенкава Ульяна Іванаўна — Чавуская гарадская акруга.

Падаляк Нікалай Ціханавіч — Сушчэўская акруга.

Чарнякоў Аляксандр Міхайлавіч — Сухарэўская акруга.

Кавалёў Афанасій Фёдаравіч — Магілеўская — Валадарская акруга.

Шуб Рувім Якаўлевіч — Магілеўская — Першамайская акруга.

Акулёнак Анна Іосіфаўна — Магілеўская — Ленінская акруга.

Рэпінскі Марк Якаўлевіч — Магілеўская — Кіраўская акруга.

Аляксейчыкава Ефімія Міхайлаўна — Грэбянёўская акруга.

Трусаў Ігнат Спірыдонавіч — Чырвонапольская акруга.

Качмароў Харлампій Архіпавіч — Цішаўская акруга.

Балашэнка Пракопій Герасімавіч — Чарназёмаўская акруга.

Волкаў Філіп Якаўлевіч — Бялыніцкая акруга.

Байкова Елена Матвееўна—Бялыніцкая сельская акруга.

Брыкаў Афанасій Данілавіч — Бярэзінская акруга.

Сокалаў Іван Іванавіч — Пагосцкая акруга.

Валчок Аляксандр Кузміч — Брадзецкая акруга.

Мізараў Павел Іванавіч — Клічаўская сельская акруга.

Кунцэвіч Аляксей Фёдаравіч — Клічаўская акруга.

Абушкевіч Карп Нікалаевіч — Дубенская акруга.

Тур Васілій Пятровіч — Ліпенская акруга.

Харытановіч Юлія Канстанцінаўна—Асіпавіцкая сельская акруга.

Шэвелеў Міхаіл Натанавіч — Асіпавіцкая гарадская акруга.

Белякоў Макар Іванавіч — Бабруйская — Ленінская акруга.

Драгун Дар'я Ісакаўна — Бабруйская—Комсамольская акруга.

Ліберман Нэха Юдэлеўна — Бабруйская — Фрунзеўская акруга.

Мінкевіч Казімір Нікалаевіч — Бабруйская—Бярэзінская акруга.

Гладышэў Ефрэм Іванавіч — Бабруйская—Першамайская акруга.

Якушэва Тацьяна Ільівічна — Рымавецкая акруга.

Ігвеў Сямён Сцяпанавіч — Бабруйская сельская акруга.

Прахарэнка Ульяна Іванаўна — Кавалеўская акруга.

Вінакурава Надзежда Якаўлеўна — Кіраўская акруга.

Лісенка Фёдар Іосіфавіч — Баровіцкая акруга.

Ягодкін Васілій Міхайлавіч — Быхаўская гарадская акруга.

Субоцін Ціт Фёдаравіч — Грудзінаўская акруга.

Пранякоў Філіп Пятровіч — Быхаўская сельская акруга.

Куляшоў Васілій Паўлавіч — Новабыхаўская акруга.

Маргелаў Канстанцін Лазаравіч — Прапойская сельская акруга.

Скаварада Аляксей Матвеевіч — Прапойская акруга.

Федасенка Агафія Іванаўна — Чэрыкаўская гарадская акруга.

Карасёў Іван Нікіфаравіч—Чэрыкаўская сельская акруга.

Баброў Касьян Еўстаф'евіч — Чырвонапольская сельская акруга.

Саўчэнка Марыя Кузьмінічна—Чырвонапольская акруга.

Югасева Агрыпіна Іванаўна — Касцюковіцкая акруга.

Салабуцін Васілій Тарасавіч — Касцюковіцкая сельская акруга.

Новік Самуіл Якаўлевіч — Бялынкавіцкая акруга.

Ляшчыніна Анна Цімафееўна — Клімавіцкая гарадская акруга.

Спасаў Пётр Сяргеевіч — Мілаславіцкая акруга.

Харланава Вера Філіпаўна — Клімавіцкая сельская акруга.

Кушчанкоў Фёдар Леонавіч — Хоцімская акруга.

Масанін Фёдар Сцяпанавіч — Беразкоўская акруга.

Потэс Надзежда Карпаўна — Бягомльская акруга.

Масленнікаў Іван Леонцьевіч — Бярэзінская акруга.

Ільінскі Анатолій Іванавіч — Зарэчанская акруга.

Якавіцкі Васілій Венедыктавіч — Плешчаніцкая акруга.

Ячменеў Георгій Фокавіч — Халопеніцкая акруга.

Кракоўская Анна Аляксандраўна—Красналуцкая акруга.

Якаўлева Марфа Сысоеўна — Крупская акруга.

Бялевіч Нікалай Іванавіч — Бобрская акруга.

Касяновіч Аляксандра Дзмітрыеўна — Кішчына-Слабодская акруга.

Левін Носан Гіршавіч — Лошніцкая акруга.

Буцько Якаў Калінавіч — Глівенская акруга.

Ліпкін Ілья Іосіфавіч — Барысаўская акруга.

Захараў Іван Антонавіч — Нова-Барысаўская акруга.

Храмая Фіцінія Іванаўна — Барысаўская-Чыгуначная акруга.

Міклашэўская Соф'я Юльянаўна — Лагойская акруга.

Калко Васілій Акімавіч — Гаенская акруга.

Балабуткін Сямён Лук'янавіч — Смалявіцкая акруга.

Шамко Фёкла Міхайлаўна — Пліская акруга.

Чарноў Канстанцін Сцяпанавіч — Смалявіцкая-Орджанікідзеўская акруга.

Абушэнка Клаўдзія Амосаўна — Заслаўльская сельская акруга.

Ачкасаў Аляксандр Іванавіч — Заслаўльская акруга.

Пташкін Іван Емельянавіч — Гарадзецкая акруга.

Кавалёў Міхаіл Пракоф'евіч — Каладзішчанская акруга.

Кульба Екацярына Якаўлеўна—Менская сельская акруга.

Шарко Ольга Канстанцінаўна — Самахвалавіцкая акруга.

Пігурноў Афанасій Пятровіч — Станькаўская акруга.

Пашкін Нікалай Семёнавіч — Дзержынская акруга.

Туранкоў Аляксей Еўлампіевіч — Менская-Дзімітраўская акруга.

Казлоў Аляксандр Іванавіч — Менская-Калінінская акруга.

Багатыроў Анатолій Васільевіч — Менская-Варашылаўская акруга.

Матвееў Аляксандр Паўлавіч — Менская-Ленінская акруга.

Ціханаў Аляксандр Пятровіч—Менская-Горкаўская акруга.

Смоляр Васілій Пятровіч — Менская-Сталінская акруга.

Платонаў Васілій Платонавіч — Менская-Куйбышэўская акруга.

Савіцкі Парфен Пятровіч — Менская-Кагановіцкая акруга.

Сабіла Павел Якаўлевіч — Менская—Чыгуначная акруга.

Якуш Пелагея Астапаўна — Смілавіцкая акруга.

Анціповіч Іван Васільевіч — Рудзенская акруга.

Стаяноўскі Міхаіл Аляксандравіч — Чэрвеньская гарадская акруга.

Кунцэвіч Іван Ігнацьевіч—Чэрвеньская сельская акруга.

Жур Елена Кірылаўна — Гарэліцкая акруга.

Чуніхін Нікалай Пятровіч — Мар'іна-Горская акруга.

Пыж Міхаіл Фаміч — Пухавіцкая акруга.

Васільеў Іван Васільевіч — Уздзенская акруга.

Папкоўскі Іосіф Іванавіч — Лошанская акруга.

Дружынін Аляксандр Іванавіч — Капыльская сельская акруга.

Зайцэў Кандрацій Грыгор'евіч — Капыльская акруга.

Марозаў Сяргей Іванавіч — Цімкавіцкая акруга.

Давідоўская Ольга Грыгор'еўна — Грэская акруга.

Рашэтнікаў Нікалай Арцёмавіч — Грозаўская акруга.

Кедрык Васілій Сямёнавіч — Чырвонаслабодская акруга.

Наседкін Аляксей Аляксеевіч — Чырвонаслабодская сельская акруга.

Кулагін Міхаіл Васільевіч — Слуцкая-Кіраўская акруга.

Кананенка Сяргей Сцяпанавіч—Слуцкая сельская акруга.

Зэрын Барыс Абрамавіч — Слуцкая-Пролетарская акруга.

Сілаеў Фёдар Пахомавіч—Слуцкая-Комсамольская акруга.

Быстроў Нікалай Міхайлавіч — Стара-Дарожская акруга.

Рыбак Іван Максімавіч — Дараганаўская акруга.

Кульган Аляксандр Герасімавіч — Горкаўская акруга.

Карпенка Сяргей Цімафеевіч — Любаньская акруга.

Парашчанка Нікіта Іванавіч — Нежанская акруга.

Усаценка Георгій Іларыёнавіч — Старобінская акруга.

Сцешыц Якаў Герасімавіч—Старобінская сельская акруга.

Красношэеў Іван Іванавіч — Глуская акруга.

Пальцэва Анна Іванаўна — Акцябрская акруга.

Васільеў Аляксей Васільевіч — Аземлянская акруга.

Кіселёў Кузьма Венедзіктавіч — Парыцкая акруга.

Хайнюк Праскоўя Іосіфаўна — Шацілаўская акруга.

Сухадольская Еўгенія Іванаўна — Дамановіцкая акруга.

Швайнштэйн Арон Абрамавіч — Азарыцкая акруга.

Ястрэмскі Канстанцін Нікалаевіч — Новасёлкаўская акруга.

Лапцеў Аляксандр Іванавіч — Капаткевіцкая акруга.

Ермак Аляксей Васільевіч — Камаровіцкая акруга.

Бумажкоў Ціхан Піменавіч — Капцэвіцкая акруга.

Музыка Сцепаніда Якаўлеўна — Петрыкаўская акруга.

Папоў Фёдар Сяргеевіч — Жыткавіцкая акруга.

Раманенка Сцяпан Матвеевіч — Тураўская акруга.

Ваўчкоў Еўціхій Кірылавіч — Лельчыцкая сельская акруга.

Каўфман Залман Ісаакавіч — Лельчыцкая акруга.

Акімаў Сцяпан Дзмітрыевіч — Буйновіцкая акруга.

Прышчэп Марыя Сяргееўна — Ельская акруга.

Ісакоў Аляксандр Іванавіч — Мазырская акруга.

Баброў Нікіта Паўлавіч — Слабодская акруга.

Маркін Дзмітрый Фёдаравіч — Калінкавіцкая акруга.

Чорны Ісаак Львовіч — Дуброўская акруга.

Гуз Фёдар Станіслававіч — Васілевіцкая акруга.

Ледзянёў Васілій Васільевіч — Хойніцкая акруга.

Казачонак Георгій Сямёнавіч — Пасельская акруга.

Маленок Юлія Пятроўна — Стралічоўская акруга.

Таміловіч-Данчанка Сяргей Аляксеевіч — Брагінская акруга.

Кавалькоў Іван Давідавіч — Брагінская сельская акруга.

Глушэц Анна Якаўлеўна — Нараўлянская акруга.

Макарэнка Лука Ефімавіч — Нараўлянская сельская акруга.

Петруненка Марыя Васільеўна — Камарынская акруга.

Лапухоў Лаўрэн Сцяпанавіч — Журавіцкая акруга.

Шалабасаў Андрэй Пятровіч — Доўская акруга.

Ефіменка Васіліса Егораўна — Кармянская акруга.

Небышынец Нікалай Еўдакімавіч — Кармянская—Літвінаўская акруга.

Горэў Канстанцін Васільевіч — Рагачоўская гарадская акруга.

Кайкоў Залман Самуілавіч — Гарадзецкая акруга.

Былінскі Владзімір Паўлавіч — Ціхініцкая акруга.

Стасенка Ніна Грыгор'еўна — Рагачоўская сельская акруга.

Цвятноў Аляксей Фёдаравіч — Жлобінская гарадская акруга.

Гардзееў Іван Сямёнавіч — Жлобінская сельская акруга.

Скарабагацька Нікалай Аляксеевіч — Стрэшынская акруга.

Тарасава Варвара Васільеўна — Чырвонаберажская акруга.

Гуценкова Еўдакія Трафімаўна — Чачэрская акруга.

Мельнікава Зінаіда Сцяпанаўна — Чачэрская сельская акруга.

Баранава Марыя Міхайлаўна — Свяцілавіцкая акруга.

Фешчанка Іван Грыгор'евіч — Пакоцкая акруга.

Ганчароў Сямён Андрэевіч — Веткаўская гарадская акруга.

Грэк Надзежда Грыгор'еўна—Веткаўская сельская акруга.

Марошак Зорух Мееравіч — Будакашалеўская акруга.

Верачынскі Егор Сцяпанавіч — Будакашалёўская сельская акруга.

Шурман Іван Сямёнавіч — Уваравіцкая акруга.

Руткоўскі Афанасій Антонавіч — Уваравіцкая сельская акруга.

Саранчук Марына Арцёмаўна — Заспенская акруга.

Пруднікава Марыя Маркаўна—Ровена-Слабодская акруга.

Пронін Матвей Сяргеевіч — Рэчыцкая сельская акруга.

Якімовіч Іван Кліменцьевіч—Рэчыцкая гарадская акруга.

Бахта Аляксандра Міхайлаўна — Рэчыцкая фабрычна-заводская акруга.

Палівалаў Міхаіл Міхайлавіч — Урыцкая акруга.

Мальцаў Сяргей Іванавіч — Гомельская сельская акруга.

Штэйнбах Грыгорый Абрамавіч — Клімаўская акруга.

Курган Ісак Маркавіч — Гомельская — Дзержынская акруга.

Мелкіх Сяргей Міхеевіч — Гомельская—Кіраўская акруга.

Левіцкі Аляксей Міхайлавіч — Гомельская—Кагановіцкая акруга.

Герман Міхаіл Емельянавіч — Гомельская — Варашылаўская акруга.

Сталяроў Платон Цімафеевіч — Гомельская-Фрунзеўская акруга.

Баравікоў Ігнат Емельянавіч — Новабеліцкая акруга.

Шліфенсон Самуіл Іосіфавіч — Добрушская гарадская акруга.

Пастухоў Фёдар Іванавіч — Добрушская сельская акруга.

Караленка Анна Ціханаўна — Ленінская акруга.

Бедзін Васілій Васільевіч — Церахоўская акруга.

Сурпін Залман Вульфавіч — Лоеўская акруга.

Барушкоў Грыгорый Мінавіч—Лоеўская сельская акруга.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЛЮБВІ І АДДАНАСЦІ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Газеты і радыё яшчэ раніцой 28 чэрвеня паведамілі працоўным Совецкай Беларусі аб бліскучай перамозе сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у першы соцыялістычны парламент квітнеючай пад сталінскім сонцам краіны — ордэнаноснай Совецкай Беларусі. Якую невымерную радасць і захапленне выклікала гэта вестка ў працоўных чырвонай сталіцы—Менска!

І не дзіва, што як толькі прагулі гудкі, калі скончыўся рабочы дзень, людзі выйшлі на вуліцу, каб прадэманстраваць сваю адданасць вялікаму маршалу соцыялістычнай радзімы, любімаму правадыру народаў таварышу Сталіну, мудраму партыі Леніна—Сталіна.

Калоны рушылі да плошчы імя Леніна з трох раёнаў Менска. На трыбуну ўзышоў саратнік таварыша Сталіна, сакратар ЦК ВКП(б) таварыш Андрэеў, кіраўнікі партыі і ўрада БССР тт. Панамарэнка, Ананцеў, Кавалёў, Наталевіч, Наседкін, Матвееў і інш.

Шэсце адкрыла калона прыгожа аформленых аўтамашын. На аўтамашынах — вялікі барэльеф першага ўсенароднага дэпутата ў Вярхоўны Совет таварыша Сталіна, партрэты яго баявых саратнікаў—абраннікаў у Вярхоўны Совет БССР—таварышоў Молатава, Варашылава, Кагановіча, Ежова, Андрэева, Мікаяна, Калініна, Жданава.

За аўтамашынамі рушылі калоны сцяганосцаў, калоны рабочых станкабудаўнічага завода імя Кірава, абутковай фабрыкі імя Кагановіча, совецкая інтэлігенцыя—работнікі навукі, літаратуры і мастацтва... Яны горача віталі сталінскага саратніка таварыша Андрэева, які прыехаў у Менск раздзяліць вялікую радасць беларускага народа—прыняць удзел у выбарах соцыялістычнага парламента рэспублікі.

Народ лікаваў. Беларускі народ дэманстраваў сваю любоў, сваю бязмежную адданасць радзіме, сваім правадырам, сваёй роднай непераможнай партыі Леніна—Сталіна, свайму любімаму, мудраму правадыру таварышу Сталіну. Беларускі народ горача віншаваў абраннікаў у Вярхоўны Совет БССР—першага дэпутата таварыша Сталіна, яго бліжэйшых саратнікаў і лепшых сыноў і дачок радзімы.

Сто трыццаць тысяч працоўных горада Менска прайшло каля трыбуны, з якой іх вітаў з перамогай сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет БССР саратнік таварыша Сталіна, дэпутат Вярхоўнага Совета — таварыш Андрэеў.

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У МЕНСКУ. Танцы каля 3 выбарчага ўчастка Дзяржынскай выбарчай акругі, дзе балатаваўся кандыдатура тав. В. М. Молатава. — Фота Б. Прывальскага (СФ).

26 чэрвеня 1938 года

А палове шостай раніцы я зірнуў у акно.

Была патайная думка раней ад усіх прыйсці на выбарчы ўчастак № 6 у парк імя М. Горкага. А па вуліцы то групамі, то паасобку ўжо цёк жывы паток выбаршчыкаў. Як відаць, шмат у каго была гэта патайная думка. Высокі чалавек з барадою, падцярэбленаю зверху, і з аблічам старажытнага егіпецкага воіна горда заявіў, што першым на сваім участку галасаваў ён.

Арганізаванасць і парадак кідаюцца ў вочы, куды ні глянеш. На шырокай адкрытай верандзе культбазы шмат кветак, плакатаў, лозунгаў. Упрыгожаныя партрэты дарагіх кандыдатаў, даўшых згоду галасавацца па БССР, — таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Ежова, Мікаяна, Жданава, Андрэева. На доўгім стале, засцеленым чырвонай матэрыяй, ляжаць газеты, кнігі, спецыяльны нумар газеты, прысвечаны кандыдату ў члены Вярхоўнага Совета Аляксандру Пятровічу Ціханаву.

За пяцю столікамі, дзе па літарах алфавіту разложаны спісы выбаршчыкаў, сядзяць члены выбарчай камісіі.

Плывуць і плывуць выбаршчыкі. Іх гасцінна сустракаюць давераныя асобы, хутка арыентыруюць аб парадку выбараў. Урачыстасць і паважнасць самой падзеі, радасць вялікага дня накладаюць свае адбіткі і на твары выбаршчыкаў.

Праходзяць пары. Нельга не звярнуць увагі на іх — глыбокая старасць ідзе пад-руку з квітнеючай маладосцю; стары бацька і маладая дачка, а, можа, і ўнучка. Жанчыны і дзеці.

На другім паверсе клапатліва абсталяван пакой для маладых грамадзян, якім трэба яшчэ шмат гадоў жыць, каб мець права на галасаванне. Вось настаўніца з падлеткам — дачкою. Яна шчасліва ўсміхаецца і кажа, паказваючы на дачку: «Прышла з маткаю, каб кантраліраваць і быць пэўнай, што я галасавала». Стары чалавек з сівою барадою, жвавы і рухавы, узбуджана гаворыць то з тым, то з другім. Усё яго абліччa вельмі нагадвае партрэт Жуль Верна.

Цёплы, густы, напорысты вецер урываецца на веранду, гартае кнігі і газеты, зазірае ў спісы выбаршчыкаў і зусім недалікатна перакульвае вазоны з кветкамі. Па ясным небе шпаркашпарка плывуць тонкія, светлыя воблачкі, лёгкія як дым. З-за купаў дрэў парку прыгожа вырысоўваюцца клубястыя, з медзяною паліваю, ёмкія хмары. Шум ветра, яснае неба, прыбраны па-святочнаму людзі, музыка аркестраў, песні — усё зліваецца ў адну радасную сімфонію ўсенароднага свята.

Тое-ж ажыўленне і святочная ўзнятасць ходзяць і па вуліцах ордэнаноснай сталіцы Совецкай Беларусі. Грыміць радыё, гулка разносіць музыку і песні па ўсіх завулках горада. Цэлымі працэсіямі ідуць выбаршчыкі па сваіх участках. Стары, пасівелы чысцільшчык з маляўнічай барадою лагодна пазірае на народ. Яму хочацца хоць з кім-небудзь падзяліцца сваімі пачуццямі і ўражаннямі.

— Можа, дзеля свята чаравікі пачысціць?

Я запыняюся. Стары чысцільшчык гаворыць: «Першым галасаваў сёння».

— А дзе вы галасавалі?

— Наш участак на Нямізе. Сабраўся народ. Рана яшчэ. Шмат моладзі. Што вы, кажу, стаіце так? Чаму не танцуеце? Ды сам пусціўся ў скокі. Усе цешыліся, а потым і самі пайшлі танцаваць. Гэткае свята — чаму-ж не парадавацца?

І сапраўды, свята вялікае і раднаснае. Веліч яго — у небывалым яднанні народа з сваёй роднай совецкай уладай, у вялікім давер'і да гераічнай партыі большэвікоў, у бязмежнай адданасці таму, у чым імені народы Совецкай зямлі знайшлі сваю радасць, сваё шчасце і веру ў сваю перамогу і светлыя заўтрашнія дні.

ЯКУБ КОЛАС.

ДЗЕНЬ ЛЮДСКОГО ШЧАСЦЯ

...І вось ён прышоў—жаданы дзень—урачысты, вясёлы, авеяны подыхам вясны, дзень людскога шчасця.

— Добрай раніцы, таварышы! Праз пяць хвілін пачнем галасаванне!

Каля выбарчага ўчастку ажыўленне. Па-святочнаму адзетыя, руплівай паходкай падыходзяць старыкі і моладзь. Быць першым — гэта самае распаўсюджанае, папулярнае жаданне ў нашай краіне. Апошнія хвіліны. Музыканты напагатове. Неўгамаваная дзетвара, з трубамі і барабанамі ўсхвалёвана чакае ўмоўнага знаку: рушыцца ў аб'езд па ўчастку. Блакітнае неба ў яркіх водблесках чэрвеньскага сонца. Натоўп выбаршчыкаў расце. Нецярпліва б'ецца сэрца. І раптам з магутнага радыё-рэпрадуктара раздаецца мілагучны звон крэмлёўскага гадзінніка. Адзін, два, тры... шэсць удараў.

Зайгралі марш. Ускрыляюцца гукі піонерскіх фанфар, рокат барабанаў. Віншаванні.

Гасцінна раскрываюцца дзверы выбарчага ўчастку.

— За Сталіна!

— За шчаслівае жыццё!

З букетамі яркіх кветак уваходзяць першыя выбаршчыкі.

Льюцца гукі плаўнага вальса. Кружацца пары маладых людзей. Машына руплівa імчыцца за Клаўдзіяй Пятроўнай Люшкевіч. Ей 83 гады. Яе папярэдзілі, што аўтамабіль будзе прысланы ў дамоўлены час. Дома не засталі.

— Дзякую за ўвагу і пашану, але я пехатой прышла.

Мікола Руткевіч прышоў з сваім гармонікам. Прагаласаваўшы, ён сеў каля фасада. Абкружылі яго моладзь і дзетвара. Паліліся гукі звонкай песні:

Не жылі, а гаравалі,
Шчасця, радасці не зналі
А цяпер, мае сябры,
Мы жыцця гаспадары.

Пад'язджае расквечаная лозунгамі і плакатамі аўтамашына. Пачынаецца канцэрт.

Святкуе Менск. Святкуе шчаслівая, свабодная ордэна Леніна Беларуская ССР.

— Помню, добра помню жахлівае мінулае жыццё,—гаворыць Сарра Абрамаўна Гальперына, уся авітая сівізнай, маці інжынера, музыканта і настаўніцы. Балюча ўспамінаць. Гора, як неадлучны цень, заўсёды хадзіла за табой. А цяпер? Ці-ж можна параўноўваць! Дзеці мае і ўнукі самыя багатыя, самыя шчаслівыя ў свеце.

Дваццаць шостае чэрвеня 1938 года.

Залатой старонкай увойдзе гэты радасны дзень у гісторыю беларускага народа, як дзень усенароднага свята, дружбы і перамог, дзень беззаветнай адданасці мільёнаў совецкіх патрыётаў сваёй радзіме, дзень славы вялікаму Сталіну, першаму дэпутату Вярхоўнага Совета ім створанай і любоўна ўзрошчанай Беларускай соцыялістычнай дзяржавы.

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Калгаснікі калгасу імя Розы Люксембург і «XI з'езд Советаў БССР», Заслаўскага раёна на выбарчым участку. Фото Л. Мазелева (СФ).

СЛАВА ГЕРОЯМ СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ!

З СПАСКА, 28 ЧЭРВЕНЯ 1938 ГОДА.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышам СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, КАГАНОВІЧУ, ВАРАШЫЛАВУ, ЕЖОВУ

ПЕРАЛЕТ МАСКВА — ВЛАДЗІВАСТОК ВЫКАНАН ЗА АДНЫ СУТКІ.

Лётчык КОКІНАКІ.
Штурман БРАНДЗІНСКІ.

З СПАСКА, 28 ЧЭРВЕНЯ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

Таварышам СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ

ВАША ДАВЕР'Е АПРАУДАУ. ЗАДАННЕ ВЫКАНАУ.

КОКІНАКІ.

ВЛАДЗІВАСТОК.

Т.т. В. КОКІНАКІ, А. БРАНДЗІНСКАМУ

Горача віншуем вас з бліскучым выкананнем ўрадавага задання.

Геаічны пералёт Масква — Хабараўск — раён Владзівастока, пакрыўшы звыш 7.600 кіламетраў найцяжэйшага шляху на працягу 24 гадзін і 36 мінут, уліевае новую выдатную старонку ў гісторыю совецкай і сусветнай авіяцыі.

Працоўныя Совецкага Саюза ганарацца вашай перамогай.

Абдымаем вас і паціскаем вашы рукі.

І. СТАЛІН	А. АНДРЭЕУ
В. МОЛАТАУ	А. ЖДАНАУ
К. ВАРАШЫЛАУ	Н. ЕЖОУ
М. КАЛІНІН	Н. ХРУШЧОУ
Л. КАГАНОВІЧ	М. КАГАНОВІЧ
А. МІКАЯН	А. ЛАКЦІОНАУ.

БЕСПАСАДАЧНЫ ПАЛЕТ ЛЕТЧЫКА В. КОКІНАКІ ПА МАРШРУТУ МАСКВА—ВЛАДЗІВАСТОК

27 чэрвеня 1938 года ў 8 гадзін 36 мінут раніцы па маскоўскаму часу вядомы ўсёй нашай краіне лётчык Кокінакі Владзімір Канстанцінавіч са штурманам Брандзінскім вылецеў у беспасадачны палёт з Масквы ва Владзівасток адлегласцю 7.000 кіламетраў на двухматорным самалёце. Самалёт стартаваў з Шчолкаўскага аэрадрома каля Масквы.

Пры старце прысутнічалі народны камісар абароннай прамысловасці таварыш Кагановіч М. М., начальнік ваенна-паветраных сіл РСЧА камандарм 2 ранга тав. Лакціонаў, канструктар Ільюшын, прадстаўнікі маскоўскага друку.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ЎРАДАВАЙ КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЁТУ МАСКВА—ХАБАРАЎСК—РАЁН ВЛАДЗІВАСТОКА

Вылецеўшы 27 чэрвеня ў 8 гадзін 36 мінут са Шчолкаўскага аэрадрома (каля гор. Масквы) у беспасадачны пералёт па маршруту Масква—Хабараўск — раён Владзівастока экіпаж ў складзе лётчыка Кокінакі В. К. і штурмана Брандзінскага А. М. на двухматорным самалёце «Москва» канструктара Ільюшына С. В. бліскуча выканаў пастаўленае заданне і 28 чэрвеня ў 9 гадзін 12 мінут па маскоўскаму часу ўдала зрабіў пасадку ў Спасску ў 155 кіламетрах ад Владзівастока.

Траса паветранага шляху Масква—Хабараўск і далей да месца пасадкі ў Спасску роўна па прамой 6.850 кіламетраў. Фактычна пройдзена за 24 гадзіны 36 мінут звыш 7.600 кіламетраў пры сярэдняй хуткасці — 307 кіламетраў у гадзіну.

Пералёт адбываўся па прамой лініі Масква—Кіраў—Чэрдынь — Ванавара — Бадайбо — Зея — Хабараўск і далей у раён Владзівастока.

Траса палёту праходзіла па недаследванай мясцовасці, над тундрай і тайгой. Палёт ажыццёўлен у надзвычай цяжкіх метэаралагічных умовах. За ўвесь шлях экіпаж бачыў зямлю толькі на працягу 1.000 кіламетраў, астатні шлях пройдзен за аблакамі і ў аблаках. Вышыня палёту хісталася ад 30 да 7.000 метраў. Пры падыходзе да Хабараўска самалёт «Москва» сустрэў магутны навальнічы фронт з воблачнасцю да зямлі. Выхад з аблакоў у горных умовах стаў немагчымым. Абыйшоўшы навальнічы фронт, экіпаж вышаў к берагу мора, дзе прабіў воблакі і прадоўжыў палёт па намечанаму маршруту. Матэрыяльная частка самалёта пасля пасадкі знаходзіцца ў поўнай спраўнасці. У баках самалёта асталося яшчэ 500 кілаграмаў гаручага. Самаадчуванне адважных лётчыкаў добрае.

Геаічны экіпаж самалёта «Москва» ўпісаў бліскучую старонку ў гісторыю совецкай і сусветнай авіяцыі.

УРАДАВАЯ КАМІСІЯ.

НАРОД ВЫБІРАЕ, НАРОД ПАСЫЛАЕ

У свой, у Вярхоўны Совет радзімы
Выдатных людзей, пераможцаў любімых
Народ выбірае,
народ пасылае
выконваць волю яго.
Адданых радзіме і справе народа,
Герояў, совецкай зямлі патрыётаў
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Прыбраліся ў чырвань заводы, калгасы,
Як песні гучаць дэпутатам наказы;
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб мужнай і мудраю, творча багатай
Дзяржаўная дзейнасць была
дэпутатаў, —
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб наша штогод багацела дзяржава,
было непахісна працоўнага права —
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб вечна жыло, што рукой
працавітай
Упарта здабыта, што будзе здабыта,—
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб дружна, шчасліва пад сонцам
вясёлым
Раслі гарады, пашыраліся сёлы —
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Глядзець — на мяжы каб стаяла са
славай
Рэспубліка наша — Саюза застава —
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб над Беларускай зямлёю заўсёды
Гарэлі Крэмлёўскія зоры свабоды —
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Народу служыць непахісна, аддана,
Радзіме Советаў, радзіме тытанаў,
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб слухалі мудрыя думкі-парады
Вялікага Сталіна ўсе дэпутаты
Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.
Каб справы дзяржаўныя так
вырашалі
На шчасце працоўным, як Ленін,
як Сталін.

Народ выбірае,
ў Совет пасылае
выконваць волю яго.

А. БУРДЗЕЛЬ.

ДЗЕНЬ ВЫБАРАУ НА ЗАХОДНЯИ ГРАНІЦЫ БССР. Пагранічнікі падраздзялення, якім камандуе лейтэнант тав. Цесленка, на аўтамашыне накіроўваюцца на выбарчы ўчастак. Фота Л. Мазелева (СФ).

28 чэрвеня ў Менску адбылася 130-тысячная дэманстрацыя працоўных горада, прысвечаная перамозе сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет БССР. На трыбуне: сакратар ЦК ВКП(б) таварыш А. А. Андрэеў, сакратар ЦК КП(б)Б тав. П. К. Панамарэнка, старшыня Соўнаркома БССР тав. А. Ф. Кавалёў, нарком унутраных спраў БССР тав. А. А. Наседкін і сакратар Магілеўскага абкома КП(б)Б тав. М. Я. Рэпінскі. Фото Я. Салавейчыка.

У ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ РСФСР

27 чэрвеня 1938 г. у Цэнтральную выбарчую камісію паступалі весткі ад акруговых выбарчых камісій аб рэзультатах галасавання ў Вярхоўны Совет РСФСР. Цэнтральная выбарчая камісія праводзіць падлік рэзультатаў галасавання па ўсіх выбарчых акругах, і поўныя даныя аб выніках выбараў у Вярхоўны Совет РСФСР будуць апублікаваны 29 чэрвеня 1938 г.

Усе акруговыя выбарчыя камісіі паведамілі, што ў дэпутаты Вярхоўнага Совета РСФСР выбраны кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных.

Поўныя даныя паступілі па выбарчых акругах горада Масквы і Маскоўскай вобласці і горада Ленінграда і Ленінградскай вобласці.

Па ўсіх выбарчых акругах горада Масквы з агульнай колькасці 2.520.146 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 2.519.848 чалавек, што складае 99,99 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў горада Масквы.

Па гораду Маскве за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.509.020, што складае 99,6 проц. усіх выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні.

Па ўсіх выбарчых акругах Маскоўскай вобласці з агульнай колькасці — 2.752.767 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 2.746.211 чалавек, што складае 99,8 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў Маскоўскай вобласці.

Па Маскоўскай вобласці за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 2.740.497 чал., што складае 99,8 проц. усіх выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні.

Па ўсіх выбарчых акругах горада Ленінграда з агульнай колькасці — 1.989.098 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 1.985.653 чалавекі, што складае 99,82 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў горада Ленінграда.

Па гораду Ленінграду за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 1.970.052, што складае 99,26 проц. усіх выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні.

Па ўсіх выбарчых акругах Ленінградскай вобласці з агульнай колькасці — 1.992.256 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні 1.980.168 чалавек, што складае 99,4 проц. агульнага ліку выбаршчыкаў Ленінградскай вобласці.

Па Ленінградскай вобласці за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 1.968.092, што складае 99,3 проц. усіх выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у галасаванні.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ КАРЭЛЬСКАЙ АССР

Па паведамленню Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет Карэльскай АССР прынялі ўдзел у галасаванні 99,7 проц. усёй колькасці грамадзян, якія карыстаюцца правам голасу.

За кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных галасавала 98,9 проц. усяго ліку прымаўшых удзел у галасаванні.

У ліку выбраных дэпутатаў у Вярхоўны Совет Карэльскай АССР — таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, Н. І. Ежоў, А. А. Жданаў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ УКРАІНСКАЙ ССР

АБ ВЫНІКАХ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ УКРАІНСКАЙ ССР.

Усяго па Украінскай ССР ёсць 21.979 выбарчых участкаў і 304 выбарчыя акругі. Па даных выбарчых акруг, зарэгістравана выбранне ўсіх 304 дэпутатаў. **Усе выбраныя дэпутаты без выключэння з'яўляюцца кандыдатамі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.**

Па УССР зарэгістравана 17.536.486 чалавек, маючых права голасу на выбарах у Вярхоўны Совет УССР. Па канчатковых даных выбарчых акруг, з гэтай колькасці выбаршчыкаў прымала ўдзел у галасаванні 17.467.909 чалавек, што складае 99,62 процанта ад агульнай колькасці грамадзян, якія карыстаюцца правам голасу.

Ва ўсіх выбарчых акругах па выбарах у Вярхоўны Совет УССР галасавала за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных 17.387.683 чалавекі, што складае 99,55 проц. да ліку галасаваўшых.

Па наяўных канчатковых даных, па г. Кіеву з 571.890 выбаршчыкаў прымала ўдзел у галасаванні 571.181 чалавек, або 99,9 процантаў усіх выбаршчыкаў. За кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных галасавала 568.275 чалавек, або 99,49 проц. прымаўшых удзел у галасаванні.

У ліку выбраных дэпутатаў Вярхоўнага Совета Украінскай ССР:

Сталін І. В. — па Сталінскай выбарчай акрузе г. Кіева;

Молатаў В. М. — па Ленінскай выбарчай акрузе г. Кіева;

Кагановіч Л. М. — па Кагановіцкай выбарчай акрузе г. Кіева;

Варашылаў К. Е. — па Нова-Ушыцкай выбарчай акрузе, Камянец-Падольскай вобласці;

Ежоў Н. І. — па Молатаўскай выбарчай акрузе г. Кіева;

Хрушчоў Н. С. — па Окцябрскай выбарчай акрузе г. Кіева;

Саломка М. А. — старшыня калгаса імя Калініна — па Стара-Ушыцкай выбарчай акрузе, Камянец-Падольскай вобласці;

Бурмісценка А. М. — па Вінніцкай гарадской выбарчай акрузе;

Каротчэнка Д. С. — па Житомірскай выбарчай акрузе;

Успенскі А. І. — па Праскураўскай выбарчай акрузе, Камянец-Падольскай вобласці;

Цімашэнка С. К. — па Магілеў-Падольскай выбарчай акрузе, Вінніцкай вобласці;

Шчэрбакоў А. С. — па Сталінскай выбарчай акрузе г. Сталіно;

Осіпаў А. В. — па Барвенкоўскай выбарчай акрузе, Харкаўскай вобласці;

Багамолец А. А., прэзідэнт Акадэміі навук УССР, — па Кіеўскай сельскай выбарчай акрузе;

Душко А. В. — па Кіраўскай выбарчай акрузе г. Кіева;

Задзіончэнка С. Б. — па Краснагвардзейскай выбарчай акрузе г. Днепрапятроўска;

Карнейчук А. Е. — па Тульчынскай выбарчай акрузе, Вінніцкай вобласці;

Патаржынскі І. С. — па Фастоўскай выбарчай акрузе, Кіеўскай вобласці;

Рабашапка С. К. — па Дзержынскай выбарчай акрузе, Сталінскай вобласці;

Целешэў Г. Г. — па Сталінскай выбарчай акрузе г. Одэсы;

Філатаў В. П. — прафесар, — па Варашылаўскай выбарчай акрузе гор. Одэсы.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ УССР.

Кіеў, 28 чэрвеня.

У ГІСТАРЫЧНЫ ДЗЕНЬ

Зара занялася. Наступаў дзень вялікай усенароднай урачыстасці—дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

У пяць гадзін раніцы ў Доме друку, дзе змяшчаецца 4 выбарчы ўчастак Молатаўскай выбарчай акругі гор. Менска, можна было заўважыць жанчыну, адзінока сядзеўшую ў кутку.

— Бабулька, чаго вы так рана?—зацікавіліся таварышы з выбарчай камісіі.

— Ды я, мае галубкі, прыехала здалёку, каб галасаваць за таварыша Варашылава,—адказала жанчына.

— Адкуль-жа вы прыехалі?

— З Бранска.

— Можа, вы раскажаце нам, што прывяло вас сюды?..

І бабулька расказала ўважліва слухаўшым таварышам вось што.

***

1935 год. Кіеў. На белай шпітальнай пасцелі памірае сын. Так, памірае. Урачы паціскаюць плячыма і на пытанне Пелагеі Андрэеўны Бальшаковай—маткі паміраючага — адказваюць: безнадзейна.

Пелагея Андрэеўна даглядае двух малых дзяцей свайго сына, змешчаных у дзіцячы сад.

Аднойчы, калі яна сядзела і думала сваю цяжкую думу пра лёс гэтых дзяцей, калі раняла гаротныя слёзы, аплакваючы сына, у сад заехаў Клімент Ефрэмавіч Варашылаў. Ён зацікавіўся ўнукамі Пелагеі Андрэеўны і, узяўшы іх да сябе на калені, пачаў распытваць бабульку: чые гэта дзеці, дзе іх бацькі і г. д.

Выціраючы хусцінкай заплаканыя вочы, Пелагея Андрэеўна, скрозь слёзы і ўсхліпванні, расказала наркому ўсё.

На твары легендарнага палкаводца, нібы цень, прайшоўся жаль. Яго глыбокія, добрыя вочы глядзелі на Пелагею Андрэеўну, і столькі суму і спачування было ў гэтых вачах! А калі Пелагея Андрэеўна скончыла, нарком сказаў:

— Усё бывае ў жыцці, Пелагея Андрэеўна. Але не клапаціцеся пра лёс сям'і—усе будуць забяспечаны. Наша вялікая радзіма, наш бацька і друг Сталін не пакідае на волю лёсу сем'і людзей, якія жыццё сваё паклалі ў змаганні за светлую будучыню.

Слёзы вялікай падзякі хлынулі з вачэй Пелагеі Андрэеўны. Ёй так хацелася абхапіць дарагую галаву гэтага простага і вялікага чалавека, пагладзіць мацярынскай рукой яго сівеючыя на скронях валасы, асыпаць яго твар гарачымі мацярынскімі пацалункамі.

Нарком ветліва развітаўся з Пелагеяй Андрэеўнай і дзецьмі і пайшоў.

Праз кароткі час сын Пелагеі Андрэеўнай памёр. І нарком не забыўся на свае слова: сям'і сына далі пенсію—450 рублёў у месяц, а ёй, узрасціўшай вернага радзіме сына,—125 рублёў у месяц пажыццёва.

Пелагея Андрэеўна насіла ў сэрцы сваім пачуццё глыбокай падзякі, не ведаючы, як і чым аддзякаваць наркома—чалавека, які замяніў ёй любімага сына і ў той-жа час стаў бацькам яе, ласкавым і клапатлівым.

Калі шчаслівыя працоўныя горада Менска, горда і аднадушна галасавалі за таварыша Варашылава, выбіраючы яго дэпутатам у Вярхоўны Совет СССР, Пелагея Андрэеўна вырашыла паехаць у Менск і таксама галасаваць за яго, каб хоць гэтым выказаць сваю глыбокую ўдзячнасць. Але хвароба перашкодзіла і мара не здзейснілася.

Але вось выбаршчыкі Молатаўскай выбарчай акругі горада Менска зноў удастоіліся гонару галасаваць за слаўнага палкаводца. Пелагея Андрэеўна пачула аб гэтым і паехала.

Яна прышла на выбарчы ўчастак задоўга да пачатку галасавання, каб першай апусціць свой бюлетэнь за наркома. Які жаль, што яна не можа галасаваць адначасова за таварыша Сталіна, за таварыша Молатава! А ёй так хацелася-б прагаласаваць і за іх, правадыроў радзімы,—светлай радзімы, у якой няма асірацеўшых сем'яў і абяздоленых матак. Які жаль, што нельга галасаваць і за іх!

Пелагея Андрэеўна апускае бюлетэнь—і гарачыя слёзы, слёзы ўдзячнасці, выходзячыя з самых патаемных глыбінь яе сэрца, цякуць па шчоках. Яна плача і смяецца ад радасці, ахапіўшай усю яе істоту, ад радасці, што яна галасуе за таго, хто стаў ёй любімым сынам і бацькам, хто з'яўляецца другам і сапатнікам таварыша Сталіна, таварыша Молатава,—яна такім чынам галасуе і за іх!

***

Гэта толькі адзін прыклад бязмежнай любві совецкага народа да сваіх правадыроў, адзін прыклад з тысячы тысяч.

Мы бачылі, як юнакі, якім толькі-што споўнілася 18 год, усю ноч сядзелі на выбарчых участках, чакаючы вялікага гістарычнага часу, калі яны ўпершыню ў сваім жыцці трапяткой ад хвалявання рукой горда падымуць бюлетэні і з пачуццем вялікай радасці апусцяць іх у урны.

Мы бачылі, як старэнькія дзядулькі і бабулькі, не шкадуючы свайго слабога здароўя, праседжвалі цэлую ноч, каб цаной бяссоннай начы дамагчыся права першымі апусціць свае бюлетэні.

Мы бачылі, як на некаторых выбарчых участках збіралася некалькі чалавек, якія жадалі першымі прагаласаваць за свайго кандыдата, і тады паміж іх узнікала спрэчка аб тым, хто-ж першы варты апусціць у урну свой бюлетэнь.

Мы бачылі, якой невыказнай радасцю былі ахоплены працоўныя гарадоў і вёсак Совецкай Беларусі, як яны лікавалі, якім незгасальным агнём палыхалі іх твары, якой рашучасцю, задорам і гатоўнасцю ісці пад бальшэвіцкім сцягам да перамогі сусветнага комунізма гарэлі іх вочы!

Старыя дзяды і бабкі, нягледзячы на свае старыя годы, разам з вясёлай і квітучай моладдзю пускаліся ў пляс, выкідваючы такія каленцы, якіх часам не выкінуць і маладому. Звоны ватроў, дрэў, нябёс злучаліся са звонам музычных інструментаў, з вясёлымі, бадзёрымі, магутнымі песнямі і плылі над лікуючай Совецкай Беларуссю. Здавалася, звінець ім вечна, плысці ім вечна, бо ўрачыстасці гэтай не будзе канца. Хіба толькі здавалася? Не! Радасць і шчасце совецкага народа—вечныя, і таму вечная яго ўрачыстасць.

Крывёю лепшых сыноў і дачок сваіх напісаў беларускі народ сваю гісторыю перамог над лютымі ворагамі ў часе баёў з белапольскімі акупантамі. Крывёю здабыў беларускі народ свае правы і залатымі літарамі запісаны яны мудрым правадыром Сталіным у вялікую бяссмертную кнігу—Сталінскую Канстытуцыю.

Ззяюць крэмлёўскія зоры, ліюць сваё рубінавае святло, саграючы цяплом усё жывое на неабсяжнай Зямлі Совецкай. Вечна гарэць гэтым зорам, вечна жыць чалавеку, запаліўшаму іх,—любімаму і роднаму Сталіну! Сагрэты цеплынёй сонца-Сталіна і крэмлёўскіх рубінавых зор, вечна будзе весяліцца беларускі народ, вечна будуць гарэць яго вочы незгасальным агнём радасці і лікавання, і ўрачыстаць яго будзе жыць вечна.

К. ЦІТОЎ.

«ПРАВДА» А. КАРНЕЙЧУКА У ПАСТОНОЎЦЫ ОДЭССКАГА ТЭАТРА РЭВОЛЮЦЫІ. Засл. арт. рэсп. І. Маяк у ролі Тараса Галоты, арт. А. Крэмарэнка ў ролі В. І. Ленін, арт. Н. Багданаў у ролі матроса-аўрораўца, арт. М. Хораш у ролі Кузьмы Рыжова.

„П Р А В Д А“

(Одэскі украінскі тэатр Рэволюцыі).

Спектакль «Правда» ў Одэскім тэатры вабіць перш за ўсё тым, што ў ім адчуваецца манументальнасць і веліч падзей, якія Карнейчук паказаў у сваёй хранікальнай драме. Народнасць, масавасць пролетарскага руху супроць здрадніцкага Часовага ўрада, рост у шырокіх масах рабочых і сялян аўтарытэту партыі большэвікоў, Леніна і Сталіна, уздым людзей з самых нізоў на гістарычныя гераічныя справы, — усім гэтым прасякнуты спектакль і ўся работа над ім пастаноўшчыка Э. Лойтэра, мастака Л. Файленгбогіна і кампазітара К. Данькевіча.

У спектаклі ёсць сцэны вялікага драматычнага напружання. Узор такой сцэны — канец другога акта, калі салдаты, высока ўзняўшы на руках параненага афіцэрска-кулацкай бандай гарманіста Ваську, ідуць на сход рабочых Піцера. З'яднанне сіл рэволюцыі супроць эсэраўска-меншавіцкай контррэволюцыі стала адзіным імкненнем франтавікоў, і гэта выразна перададзена ў сцэне, якой канчаецца другі акт.

Цікавай уласцівасцю гэтага спектакля з'яўляюцца ўдачы некаторых эпізадычных ролей. Надзвычайна цёпла і пераканаўча іграе артыст Піўнеў невялікую ролю салдата-гарманіста Васі Сідарава. У ігры артыста шмат прывабнасці і задушэўнасці.

Проста і шчыра вядуць эпізод ля казармы два салдаты-вартавыя Мірошнічэнка і Цвёрдахлеб. Простая чалавечая гутарка двух сялян-беднякоў у салдацкіх шынэлях аб зямлі, іхная страсць да зямлі перададзена акторамі з выключнай паўнатой пачуццяў.

Артыст А. Крэмарэнка багата і ўдумліва папрацаваў над сцэнічным увасабленнем вобраза вялікага Леніна, і ён многага дасягнуў у сваім выкананні. Ен здолеў удала перадаць некаторыя рысы знешняга вобліку любімага Ільіча — яго паходку, манеру гаварыць, жэсты. Артыст не без поспеху імкнецца перадаць мудрую і геніяльную прастату Леніна, вялікую сілу яго ўплыву на масы, спакойную і цвёрдую ўпэўненасць у перамозе, глыбокае пранікненне правадыра ў народную душу (сцэна гутаркі з Тарасам) і глыбокае разуменне ім народных мар і дум. Спакойна і выразна вядзе артыст гутарку Леніна па тэлефону са Сталіным.

Аднак тое, што дасягнута акторам, ёсць толькі пачатак велізарнай работы над вобразам Ільіча.

Ролю Тараса Галоты засл. арт. УССР І. Маяк іграе моцна, упэўнена, поўнакроўна. Ен не стылізуе жэстаў, паходкі, манер, знешняга вобліку украінскага селяніна-бедняка. З першага паяўлення на сцэне артыст дае гледачу адчуць, што ў вобразе Тараса захавана вялікая народная сіла і мудрасць, з дапамогай якіх народ знойдзе шлях да праўды. Гнеў да здрадніка Цімафея Рыжова, да салдатаў, якія падаліся кулацка-афіцэрскай правакацыі, і любоў да большэвіка-токара Кузьмы, да Ваські артыст перадае глыбока эмацыянальна і хвалююча. Радасная сустрэча з В. І. Леніным у гістарычную ноч Кастрычніцкага перавароту сыграна акторам разумна і мякка, без напружання. Вобраз Тараса Галоты—удача артыста Маяка і Одэскага тэатра Рэволюцыі.

Артыст М. Хораш іграе ролю Кузьмы Рыжова пераважна акварэльнымі фарбамі, у мяккіх бытавых інтанацыях. Нам думаецца, што такая інтэрпрэтацыя вобраза загартаванага, выпрабаванага большэвіка, рабочага Кузьмы недастатковая.

Шчыра і проста іграе засл. арт. рэспублікі Г. Мешчэрская ролю Марфы. Прыемна і цёпла вядзе артыстка К. Дамброўская ролю Наташы.

Артыст М. Багданаў стварыў вобраз мужнага і адданага рэволюцыі аўрораўца Дрымбы.

Артысту Я. Возіяну поўнасцю не ўдаўся вобраз бяздарнага дэмагога, істэрыка і пазёра, здрадніка радзімы Керэнскага. Актор іграе ролю Керэнскага надта спакойна, у павольным, вялым тэмпе, клапоцячыся, як відаць, галоўным чынам, аб знешнім вобліку Керэнскага. Актору больш удалося паказаць Керэнскага як нікчэмнага баязліўца, чым як заклятага ворага народа, сабрата зіноўеўска-каменеўскай здрадніцкай банды.

Рэжысура спектакля недастаткова працавала над адмоўнымі вобразамі. А гэта сур'ёзная хіба, таму што праўдзівае раскрыццё подлага здрадніцкага твару гандляроў радзімай, рыхтаваўшых замах на мозг рэволюцыі — Леніна, яшчэ больш мабілізавала-б патрыятычныя пачуцці ў гледача і нянавісць да подлых ворагаў народа.

У схематызме паказу ворагаў, якія адыгрывалі досыць вялікую ролю ва ўсёй зграі здраднікаў радзімы, як Дан, Гоц, генеральская шайка, вінен у значнай меры і драматург. Аднак і тэатр не папрацаваў над гэтымі вобразамі з дастатковай глыбінёй. Артысты Балакін і Ярыгін іграюць ролі Гопа і Дана досыць бледна і не выразна. Не здавальняе ігра артыста Кашачэўскага ў эпізадычнай ролі памешчыка Басава і ігра Лаппа ролі памешчыка Чубатэнка.

Каларытная фігура эсэраўскага хлюпіка — станцыйнага тэлеграфіста — сыграна артыстам Бабенкам таксама не выразна.

«Правда» ў Одэскім тэатры Рэволюцыі, пры ўсіх сваіх вялікіх і малых недахопах, — рэалістычны і гістарычна праўдзівы спектакль, які з усёй наглядласцю паказвае, што тэатр за гэтыя годы значна ўзняў сваю мастацкую культуру, акторскае майстэрства.

М. МОДЭЛЬ.

УДЗЕЛ МАСКОЎСКАГА ТЭАТРА РЭВОЛЮЦЫІ Ў ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

За час знаходжання ў Менску Маскоўскі тэатр Рэволюцыі правёў вялікую работу па мастацкаму абслугоўванню выбаршчыкаў. За гэты перыяд намі дадзена 14 канцэртаў на розных выбарчых участках (галоўным чынам, у Прамысловай выбарчай акрузе) і 9 выступленняў у тэатры перад спектаклямі. Больш 50 актораў нашага тэатра прынялі ўдзел у гэтых канцэртах.

Акрамя таго, камітэт комсамола нашага тэатра разам з гаркомам комсамола і райкомам чыгуначнікаў арганізаваў сустрэчу з маладымі выбаршчыкамі ў парку імя Горкага. Тры спектаклі мы далі для часцей Чырвонай Арміі. Два разы выязджалі з канцэртамі на пагранічныя заставы. У доме Чырвонай Арміі была наладжана сустрэча работнікаў нашага тэатра з байцамі, камандзірамі, палітработнікамі і іх сем'ямі. На гэтай сустрэчы дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Навіцкі зрабіў даклад аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Заслужаны артыст М. М. Штраух расказаў аб сваёй рабоце над вобразам Леніна ў спектаклі «Правда». У заключэнне чамі было паказана некалькі ўрыўкаў са спектакляў, якія ідуць у нашым тэатры, і рад канцэртных нумароў (мастацкае чытанне, ігра на скрыпцы і гітары і рад іншых нумароў). Потым выступаў ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі Дома Чырвонай Арміі.

У сваіх выступленнях на выбарчых участках і для часцей Чырвонай Арміі мы паказалі ўрыўкі з п'ес «Правда», «Гибель» эскадры», «Первая конная», «Очная ставка», «Собака на сене», «Ромео и Джульета» і рад канцэртных нумароў.

Гледачы заўсёды горача віталі актораў нашага тэатра.

Нашы гастролі падыходзяць да канца. Мы паедзем у Одэсу з пачуццём найглыбейшай удзячнасці да працоўных братняй Беларускай Рэспублікі, якія аказалі нам такі гасцінны прыём.

А. КАЛУГІНА.

Сакратар партнома Маскоўскага тэатра Рэволюцыі.

—о—

37 канцэртаў Філармоніі БССР

Калектывы Дзяржаўнай філармоніі БССР правялі вялікую работу на выбарчых участках. У парадку падрыхтоўкі да выбараў калектывы Філармоніі далі на ўчастках 16 бясплатных канцэртаў. У дзень выбараў—26 чэрвеня—тры брыгады Філармоніі ў складзе 50 чалавек далі на выбарчых участках пяці выбарчых акруг 21 канцэрт.

Выступалі гарманісты, цымбалісты, танцоры, чытальнікі і інш. У рэпертуары былі беларускія і яўрэйскія народныя песні і пляскі, выбарчыя спевы, вершы і г. д.

Шматлікія водгукі старшынь участковых выбарчых камісій адзначаюць вельмі ўдалую праграму выступленняў канцэртных брыгад і добрае ўражанне выбаршчыкаў. Усе брыгады Філармоніі выключна добрасумленна, з вялікім энтузіязмам аднесліся да сваіх выступленняў на выбарчых участках.

ПЕРАМОЖЦЫ СУСВЕТНАГА КОНКУРСА ПІЯНІСТАЎ ІМЯ ІЗАІ

Праезд лаўрэатаў праз Менск, злева ЭМІЛЬ ГІЛЕЛЬС (1-я прэмія), справа ЯКАЎ ФЛІЕР (3-я прэмія); у цэнтры — член журы конкурса ад СССР — прафесар-ордэнаносец С. ФЕЙНБЕРГ. Зарысоўка А. Кастамалоцкага.

ВЫХАВАНЦЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ

25 чэрвеня раніцою ў совецкую краіну вярнуліся совецкія піяністы — удзельнікі міжнароднага конкурса піяністаў у Брусэлі—Эміль Гілельс, Якаў Фліер, Ісак Міхноўскі, Павел Серабракоў і праф. Фейнберг.

Як вядома, Эміль Гілельс і Якаў Фліер атрымалі на конкурсе бліскучую перамогу, заваяваўшы першае і трэцяе месцы, лішні раз прадэманстраваўшы перад усім светам перавагу совецкай музыкальнай культуры.

Выступаючы на мітынгу на ст. Негарэлае, тав. Гілельс заявіў:

— Усе цяжкасці ў складанейшым спаборніцтве мы перамаглі дзякуючы бацькоўскім клопатам партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна аб маладым совецкім пакаленні, якое хавае ў сабе невычарпальныя крыніцы талентаў...

Маладыя музыканты Парыжа і Брусэля вельмі здзіўляліся, слухаючы расказы Эміля Гілельса, Якава Фліера і іншых совецкіх піяністаў — аб умовах жыцця і вучобы маладых дараванняў у Совецкім Саюзе. У капіталістычных краінах моладзь, у тым ліку самая даравітая, вядзе жалкае існаванне, не сустракаючы нідзе падтрымання. Англійская грамадскасць, напрыклад, аднеслася зусім абыякава да перамогі свайго суродзіча Джонстон, атрымаўшай на конкурсе другую прэмію. Прадстаўнік Уругвая — Марына Беліні была пазбаўлена стыпендыі, як толькі ўрад гэтай краіны даведаўся, што Беліні атрымала на конкурсе пятую прэмію. Лепшыя піяністы капіталістычных краін лічаць сябе шчаслівымі, калі ім удаецца атрымаць работу ў якім-небудзь захудалым рэстаране і зарабіць на жыццё.

Няма нічога дзіўнага, што совецкія піяністы катэгарычна адхілілі ўсе прапановы аб канцэртным турнэ па Еўропе і Амерыцы і паспяшылі вярнуцца на радзіму, дзе нават само паветра чысцей і лепш і дзе жыць і тварыць — ні з чым непараўнальнае шчасце.

У дзень выбараў у Вярхоўныя Советы РСФСР, УССР і БССР совецкія піяністы—удзельнікі міжнароднага конкурса ў Брусэлі — далі свой першы пасля звароту з-за граніцы канцэрт. Слухачы вельмі цёпла сустрэлі сваіх любімцаў. Канцэрт трансліраваўся па радыёстанцыі імя Комінтэрна і разам з слухачамі, якія сабраліся ў Дом культуры калектыва работнікаў «Правды», ім апладыравалі мільёны радыёслухачоў, якія сабраліся ля сваіх радыёпрыёмнікаў і рэпардуктараў.

ГАСТРОЛІ УЗБЕКСКАГА АНСАМБЛЯ

3-га ліпеня па запрашэнню Дзяржаўнай філармоніі БССР у Менск на гастролі прыязджае ансамбль народнай музыкі, песні і танцаў Узбекістана пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора, народнага артыста УзССР, кампазітара-ордэнаносца Тахтасына Джалілава.

Прыезд ансамбля—радасная падзея ў гэтым канцэртным сезоне Менска. Працоўныя БССР, бясспрэчна, з вялікай цікавасцю пазнаёмяцца з мастацтвам братняга узбекскага народа,—мастацтвам, якое з вялікім поспехам было прадэманстравана ў мінулым годзе на дэкадзе ў Маскве.

Прыязджаючы ў Менск ансамбль уваходзіць у склад Узбекскай ордэнаноснай Дзяржаўнай філармоніі, арганізаванай у верасні 1936 г. Нягледзячы на параўнальна невялікі тэрмін свайго існавання, Філармонія дабілася значных поспехаў у выхаванні моцнага, здольнага калектыва. Гэта тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што Філармонія стваралася на аснове адбору лепшых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, любімых песняроў узбекскага народа, таленавітых танцораў, «аскія-базаў»—вострасловаў, народных камедыянтаў.

У дарэволюцыйны час музыка узбекскага народа адзначалася беднасцю інструментаў (найбольшае распаўсюджанне мелі вялікія двухметравыя медныя трубы—«карнаі» і габоепадобныя духавыя інструменты), спевы—аднастайнымі, цягучымі, сумнымі матывамі. У іх адлюстроўвалася жабрацкае, забітае жыццё працоўных пад прыгнётам баёў, духавенства і царскіх сатрапаў. На народных гуляннях—«саілях», якія часам наладжвалі заможныя пласты насельніцтва і духавенства, панавалі нуда і маркота. Асабліва сумна выглядалі жаночыя постаці, захутаныя ў чорныя паранджы.

Як не падобны дарэволюцыйныя «саілі» на цяперашнія народныя святы—«тоі». На «тоях» прысутнічаюць мужчыны і жанчыны, юнакі і дзяўчаты. Чорная паранджа даўно забыта. Шматлікія калектывы мастацкай самадзейнасці дэманструюць свае дасягненні. Мастацтва узбекскага народа, разняволенае Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй, расквітнела пышным цветам. Радуюць шматстайнасць нацыянальных інструментаў, выключныя па прыгожасці і пластычныя, яркія, тэмпераментныя танцы, гучныя, вясёлыя песні.

Ансамбль народнай музыкі, песні і танцаў Узбекістана прадэманструе ў Менску лепшыя ўзоры узбекскага мастацтва.

У ансамблі прымаюць удзел: народны артыст УзССР, ордэнаносец Кары Якубаў, салісты балета: ордэнаносец Розія Карымава, Ісыхар Акілаў, Назар Задэ, герой працы Ахмеджан Умурзакаў і інш. Танцы пойдуць у пастаноўцы народных артыстаў УзССР, ордэнаносцаў Уста Алім Камілава, Тамары Ханум, Мукарам Тургунбаевай.

Усяго ў ансамблі 80 чалавек. У Менску ансамбль дасць 11 канцэртаў, потым выедзе ў Віцебск і Гомель.

П.



Кіраўнік танцавальнай групы узбекскага ансамбля ІСАХАР АКІЛАЎ.

„ПАРТЫЗАНЫ“ К. КРАПІВЫ

З выступлення тав. Вольскага на пленуме Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР

«Трэба ўсямерна ўзмацніць і ўмацаваць нашу Чырвоную Армію, Чырвоны Флот, Чырвоную авіяцыю, Асоавіяхім. Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку»... — пісаў І. В. Сталін у сваім пісьме да тав. Іванова.

Адсюль вынікаюць задачы і для нашай драматургіі.

Нам патрэбны такія п'есы, такія драматычныя творы, якія падрыхтоўвалі-б працоўныя масы краіны да абароны сваёй соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Адным з такіх твораў з'яўляецца п'еса К. Крапівы «Партызаны», прысвечаная барацьбе беларускіх народных мас у 1919 годзе супроць белапольскіх акупантаў.

«Партызаны» — п'еса рэалістычная, жыццёвая.

У праўдзівых і яскравых эпізодах паслядоўна паказан у п'есе рост партызанскага руху, рост самасвядомасці беларускіх народных мас, якія не маглі прымірыцца з панаваннем чужаземных акупантаў, аднаўленнем улады памешчыкаў і капіталістаў.

Змест п'есы разгортваецца па двух лініях, у двух планах — у народна-бытавым і гераічным.

Дзеючыя асобы п'есы рэзка падзяляюцца на два супроцьлеглыя, варожыя, непрымірымыя лагеры. З аднаго боку мы бачым вобразы народнай масы—мужнай, гераічнай, сумленнай і адданай, якая змагаецца за сваё вызваленне, за лепшую будучыню. З другога боку—ворагі народа, паны Яндрыхоўскія з сваімі агіднымі паслугачамі накшталт кулака Маргуна і яго дачкі Кацярыны, шляхціча Шмігельскага і інш.

Вобразы прадстаўнікоў народнай масы моцныя сваёй тыповасцю і непасрэднасцю, сваёй праўдзівасцю.

Гэта—Даніла Дрыль, яго маці, сястра Марылька, дзед Бадыль і яго ўнучка Настулька, бежанец Батура, партыец Скіба, партызаны Кастусь, Халімон, Міхаль і інш.

Гэта — вобразы непрыкметных герояў партызанскай вайны, верных сыноў сваёй радзімы.

З гэтай катэгорыі вобразаў асабліва вылучаецца дзед Бадыль. Другарадны, па сутнасці, вобраз дзеда Бадыля набывае ў п'есе пераважнае, амаль пануючае значэнне. Гэта вобраз найбольш жывы і каларытны, найбольш дакладна распрацаваны. Усімі сваімі карэннямі, усёй сваёй істотай звязан дзед Бадыль з народнымі масамі, з вуснай народнай творчасцю, з персанажамі беларускай казкі, мудрай і дасціпнай, прасякнутай нянавісцю да паноў-прыгнятальнікаў.

Паўната драматургічнай характарыстыкі зрабіла гэты вобраз глыбока чалавечным, праўдзівым і моцным.

У супроцьлегласць дзеду Бадылю, вобраз Данілы Дрыля, які па замыслу аўтара павінен быць у п'есе асноўным, вядучым, разгорнут недастаткова. Характар яго, акрамя даверлівасці да Рыгора, амаль зусім не раскрываецца. Якім ён з'явіўся ў першай дзеі, такім ён застаецца і ў апошняй. Яго соцыяльная сутнасць, яго ідэйная накіраванасць вядомы гледачу паводле яго слоў і ўчынкаў. Але яго індывідуальныя якасці, яго чалавечая сутнасць не раскрыты ў п'есе як след.

У асобе падпольнага працаўніка Скібы аўтар удала паказаў кіруючую арганізацыйную ролю партыі ў беларускім партызанскім руху ў часы белапольскай акупацыі.

Звяртае на сябе ўвагу цікавы і жыццёвы вобраз бежанца—паляка Батуры, вясковага жартаўніка і гарманіста. Ен нібыта ўвасабляе ў п'есе інтэрнацыянальнае адзінства працоўных. Яго гармонік і прыпеўкі адыгрываюць не малую ролю ў развіцці партызанскага руху і ў падпольнай рабоце.

Досыць дакладна выпісаны аўтарам такія эпізадычныя ролі, як Настулька, партызан Халімон і інш.

Вобразы партызанаў рознастайныя, індывідуальныя, каларытныя. Усе яны згуртаваны адзінствам мэты, адзінствам думак і імкненняў, аб'яднаны адным агульным кіраўніцтвам.

З асобных характэрных і самастойных вобразаў прадстаўнікоў народнай масы складаецца ў п'есе і ўстае перад намі на ўвесь свой рост адзін вялікі, сапраўдны і многатвары герой — народ.

Лепшыя маральныя якасці працоўнага люду—яго непахісны аптымізм, вера ў свае сілы, самаадданасць, пачуццё інтэрнацыянальнай братэрскай салідарнасці, благародства—супроцьстаўляюцца ў п'есе ўнутранай спустошанасці, агідным і нізкім пачуццям ворагаў—іх сябелюбству, жорсткасці, прагнасці да грошай, да ўласнага, асабістага ўзбагачэння.

Маці Данілы гіне за свайго сына, сваёю смерцю ратуючы яму жыццё; сялянка Тадора Куксёнак просіць пані Яндрыхоўскую прыбавіць ёй бізуноў, абы толькі не раскідалі хату, каб дзеці мелі на зіму прытулак; Даніла Дрыль, рызыкуючы жыццём, прыходзіць у вёску за сястрой і давяраецца Рыгору, як другу свайго дзяцінства; дзед Бадыль не згінаецца перад пагрозамі паноў і смела кажа праўду ў вочы. Можна прывесці шмат такіх прыкладаў паказу высокіх маральных якасцей працоўных.

Вобраз Рыгора мае ў п'есе крыху асаблівае месца. Рыгор стаіць на раздарожжы, паміж двух варожых лагераў.

Рыгор не разумее спачатку неабходнасці актыўнай барацьбы за шчасце ўсяго народа. Ен думае толькі пра сваё ўласнае асабістае шчасце. Ен думае, што кожны сам, паасобку, павінен здабываць сабе лепшую долю. Яго мары, яго імкненні абмежаваны кавалкам уласнай зямлі і ўласнай індывідуальнай гаспадаркай.

У вобразе Рыгора глядач бачыць выразнае ўвасабленне «двух душ» селяніна і гучнымі воплескамі вітае перамогу ў ім пачуцця класавай салідарнасці.

Рыгор раскрываецца не адразу, і «загадка вобраза» хвалюе гледача. Глядач не ведае да канца, што зробіць Рыгор, з кім пойдзе ён, нарэшце, — ці прадасць ён Данілу ворагам, ці адмовіцца ад Кацярыны і далучыцца да партызанаў.

Гэта і ставрае драматычную напружанасць, без чаго ні адна п'еса не можа добра гучаць на сцэне.

Трэба сказаць, што значна менш удаліся аўтару вобразы адмоўнага плана. Вобраз капітана Яндрыхоўскага спрошчаны. Ен пабудаван аўтарам выключна на адных толькі знадворных «класавых» адзнаках і таму амаль цалкам пазбаўлен жывых чалавечых рысаў.

Прыблізна, тое самае можна сказаць і пра маці яго, пані Яндрыхоўскую, — вобраз таксама досыць бледны, невыразны, схематычны.

Выключэннем з'яўляецца Кацярына. Гэты вобраз яскравы і сакавіты. Добра тое, што Кацярына дадзена аўтарам у простых, звычайных і жыццёвых тонах (так яна трактуецца і тэатрам). Іменна праз гэту прастату і звычайнасць яшчэ больш выразна і пераканаўча раскрываецца перад гледачом яе кулацкая, уласніцкая, драпежная сутнасць.

Між іншым, дарэмна ўваскрашае Крапіва Кацярыну ў апошнім акце. Пасля сцэны ў хаце Рыгора, пасля таго, як Рыгор ударыў яе нажом і пайшоў да партызанаў, драматургічныя функцыі Кацярыны скончаны. У п'есе яна больш не патрэбна.

Досыць пераканальным здаецца нам бацька Кацярыны, кулак Маргун.

Асобныя сітуацыі, нават цэлыя карціны аўтарам распрацаваны дасканала, закончана з драматургічнага боку. Асобныя карціны вельмі сцэнічныя, але ўсе яны разам не складаюць аднаго кампазіцыйнага цэлага. Кожная з карцін мае самастойнае значэнне. Для п'есы ў цэлым нехапае адзінага сюжэта, нягледзячы на тое, што ў асобных карцінах ёсць даволі выразныя элементы сюжэтнай драмы.

З прычыны адсутнасці агульнага сюжэта «Партызаны», як, дарэчы, і амаль усе нашы п'есы, прысвечаныя паказу грамадзянскай вайны, маюць пераважна ілюстрацыйна-хранікальны характар.

Штучна ўстаноўленай у п'есу, не звязанай з развіццём дзеі здаецца нам сцэна з захопам партызанамі маці капітана Яндрыхоўскага. Гэты момант, таксама як і забойства Антося, уведзены аўтарам, мабыць, толькі для таго, каб стварыць некалькі сцэнічных эфектаў для паказу партызанаў у лесе. Між тым, асобныя сітуацыі павінны лагічна і паслядоўна выцякаць адна з другой, ствараючы суцэльную сюжэтную лінію. Усе яны павінны быць падпарадкаваны аднаму цэламу, усе павінны служыць найбольш поўнаму раскрыццю характараў дзеючых асоб.

Агульны тонус п'есы Крапівы ўздымны, жыццёрадасны, аптымістычны, нягледзячы на асобныя меладраматычныя моманты. Гэтаму не мала спрые ўдалае выкарыстоўванне фальклору і жывая каларытная мова, багата насычаная народным гумарам.

Элементы фальклору амаль усюды арганічна звязаны з тэкстам. Удала выкарыстоўваюцца элементы народна-бытавой абраднасці ў сцэне замаскіраванага сватаўства, пад выглядам якога вядуць сваю падпольную работу, заклікаючы сялян у партызанскі атрад, партыец Скіба і партызан Антось. Добра гучаць народныя спевы ў партызанскіх сцэнах у лесе (4 карціна, II акт). Вельмі дарэчы прыпеўкі Батуры, Кастуся і Настулі на вуліцы ў вёсцы. (5 карціна, III акт). Яны ўвесь час ажыўляюць гутарку, нібыта ілюструюць яе, ствараючы адпаведны настрой.

Значэнне гэтай п'есы ў яе народнасці, у тым, што яна сугучна думкам і пачуццям народных мас Совецкай Беларусі—патрыётаў нашай соцыялістычнай радзімы.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

…арня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г—4708.